Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| ___________Д.В.Герасімёнак | ___________Ю.М.Галкоўская |
| “__” _________2023 г. | “__” __________2023 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
**“ГІСТОРЫЯ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ”**
для спецыяльнасці 1-23 01 12 “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” (па напрамках)

Складальнік: А.А. Трусаў, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта “21” сакавіка 2023 г. пратакол № 7

Складальнік:

*Трусаў А.А., дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*

Рэцэнзенты:

Гулак А.А., загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук;

Голубеў В.Ф., загадчык Цэтра спецыяльных гістарычных навук і антрапалогіі ДНУ “Інстытут гісторыі” НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар.

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

*Кафедрой гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*(пратакол ад 25.01.2018 г. №8 );*

*Саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый*
*(пратакол ад 2018 г. № )*

**Змест**


1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 3

2 ТЭАРЫТЫЧНЫ РАДЗЕЛ 6

2.1 План-канспект лекцый 6

3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 16

3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 16

3.2 Тэматыка практычных заняткаў 19

4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 22

4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў 22

4.2 Пытанні да самаправеркі 22

4.3 Пытанні да экзамена 23

5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 25

5.1 Тэматычны план 25

5.2 Асноўная літаратура 26

5.3 Дадатковая літаратура 28

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гісторыя матэрыяльнай культуры – агульнаадукацыйная дысцыпліна, выкладанне якой вядзецца ў паглыбленым аб'ёме ў форме лекцый, семінарскіх заняткаў і самастойнай работы. У гэтым курсе паслядоўна разглядаюцца эканамічныя і культурныя працэсы, якія спрыялі паступоваму тэхналагічнаму прагрэсу чалавецтва на ўсіх этапах яго гістарычнага развіцця. Асобна вызначаны тэмы, звязаныя з гісторыяй транспарту, аддзеннем і модай, прадуктамі харчавання, медыцынай і аховай здароўя, архітэктурай і урбаністыкай.

Месца вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя матэрыяльнай культуры" вызначаецца зместам яе вывучэння, асабліва тэмы па гісторыі матэрыяльнай культуры тых краін і народаў, якія не вывучаюцца па вучэбнай дысцыпліне “Усеагульная гісторыя”. Сюды адносіцца матэрыяльная культура бронзавага і жалезнага вякоў, у тым ліку скіфаў, сарматаў, кельтаў і розных германскіх плямёнаў, а таксама старажытнай Японіі і Венгрыі.

Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню матэрыяльнай культуры славянскіх народаў на розных этапах іх развіцця, а таксама народаў Прыбалтыкі. Упершыню разглядаюцца помнікі матэрыяльнай культуры такіх незалежных славянскіх краін эпохі сярэдневечча, як Ноўгарад, Пскоў і Вялікае княства Цвярское.

Пры выкладанні дысцыпліны “Гісторыя матэрыяльнай культуры” ўлічваецца яе сувязь з такімі гуманітарнымі дысцыплінамі, як «Гісторыя Беларусі», «Усеагульная гісторыя» і «Археалогія». У працэсе навучання прадугледжана актуалізацыя міжпрадметных сувязей па дысцыплінах: «Этнаграфія і этналогія Беларусі», «Гісторыя і тэорыя культуры».

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне сацыяльнай і адукацыйнай кампетэнцыі студэнтаў, а таксама агульных ўяўленняў аб шматгранным працэссе развіцця матэрыяльнай культуры ў розныя эпохі гісторыі грамадства.

Важнейшымі *задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

- раскрыццё сутнасці і паслядоўнасці гістарычнага развіцця матэрыяльнай культуры чалавецтва ад яе вытокаў да сучаснасці;

- асэнсаванне ролі археалагічных, этнаграфічных і пісьмовых крыніц для вывучэння гістарычнага мінулага насельніцтва Свету і Еўропы;

- вывучэнне матэрыяльных аспектаў грамадскага і штодзённага побыту і культуры паўсядзённасці.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны

*ведаць:*

- сувязь прычын і следства гістарычных падзей і працэсаў тэхнічнага прагрэсу;

- сутнасць як рэвалюцыйнага, так і эвалюцыйнага шляху развіцця тэхнічнага прагрэсу і яго ўплыў на экалогію планеты;

- асаблівасці развіцця гісторыі культуры і архітэктуры розных цывілізацый старажытнасці, звязаныя з кліматычнымі ўмовамі і рэлігійнымі асаблівасцямі;

- гісторыю вынаходніцтва і імёны вынаходнікаў у розных галінах культурнага і тэхнічнага прагрэсу (архітэктура, транспарт, прамысловасць, рамёствы, дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва).

Студэнты павінны *ўмець:*

- вызначаць ролю гісторыі матэрыяльнай культуры ў агульным гістарычным працэсе развіцця сусветнай цывілізацыі;

- дакладна аналізаваць гістарычныя падзеі і факты і іх уплыў на тэхнічны працэс, параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, адлюстраваныя ў гістарычных крыніцах;

- крытычна аналізаваць крыніцы на розных мовах і аргументаваць уласны пункт гледжання;

- вылучаць асноўныя дасягненні ў галіне гісторыі культуры першых цывілізацый эпохі неаліту і бронзы, у тым ліку і дакалумбавай Амерыкі.

Студэнты павінны *авалодаць:*

- асноўнымі і дадатковымі крыніцамі ў іх узаемасувязі і разнастайнасці для атрымання поўнай інфармацыі па вывучаемых праблемах, асабліва пры падрыхтоўцы да семінарскіх і самастойных заняткаў;

- інфармацыяй з інтэрнета, а таксама розных навучальных фільмаў і іншага ілюстрацыйнага матэрыялу.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

–метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры» прадугледжана 70,5 гадзін, з іх 54 – аўдыторных (38 – лекцыйных, 16 – семінарскіх). Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

Зместам вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя матэрыяльнай культуры” прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені:

**Акадэмічныя кампетэнцыі спецыяліста**

АК-8 Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі спецыяліста**

**САК–6** Мець навыкі работы ў камандзе.

**САК–7** Мець навыкі фармулёўкі і абароны свайго меркавання.

**Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыялістаў**

**ПК–14** Планаваць, арганізоўваць і весці навукова-метадычную і вучэбна-метадычную работу.

**Інавацыйная дзейнасць**

**ПК–16** Здзейсняць паказ, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па перспектывам развіцця отраслі, інавацыйным тэхналогіям, праектам і вырашэнням.

**ПК–17** Вызначаць інавацыі і спосабы іх дасягнення.

**ПК–18** Працаваць з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай.

## 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 2.1 План-канспект лекцый

### Уводзіны

Мэты і змест курса гісторыі матэрыяльнай культуры. Перыядызацыя і розныя падыходы да яе. Агляд асноўнай і дадатковай літаратуры па курсе. Вызначэнне тэрмінаў і паняццяў: культура, цывілізацыя, матэрыяльная культура, духоўная культура.

### Раздзел І Першабытнае грамадства

### Тэма 1 Станаўленне матэрыяльнай культуры чалавецтва ў перыяд каменнага веку

Станаўленне чалавека. Ад архантропа да неантропа. Развіццё антрапалогіі як навукі. Знаходкі рэштак першабытнага чалавека ў Афрыцы і Азіі. З'яўленне чалавека ў Еўропе. Асноўныя перыяды палеаліту. Палеалітычнае мастацтва.

Змены ў клімаце, узнікненне сучаснага рэльефу Еўропы і Азіі. Рассяленне першабытнага чалавека. Засяленне Амерыкі. Крэмніевыя прылады працы. Мікраліты і макраліты. Пераход да новых формаў палявання. Лук і стрэлы. Першы сухапутны і водны транспарт. З'яўленне свойскай жывёлы. Рыбалоўства і збіральніцтва. Развіццё матрыярхату.

Неалітычная рэвалюцыя. Выраб керамікі. Узнікненне ткацтва і земляробства. Неалітычныя шахты-капальні. З'яўленне першых цывілізацый. Удасканаленне каменных прылад працы. Неалітычнае мастацтва. Петрографы і пісаніцы. Пахавальны абрад. Культ продкаў.

### Тэма 2 Каменны век Еўропы

Кліматычныя ўмовы. Ледніковая фауна і флора. Матэрыяльная культура неандэртальцаў. Асваенне агню. Першае адзенне. Загоннае паляванне. Жытло.

З'яўленне краманьёнцаў. Археалагічная культура верхняга палеаліту Еўропы. Змены клімату. Засяленне поўначы Еўропы.

Паляўнічыя і рыбаловы. Новыя прылады працы. Неалітычная рэвалюцыя. Першыя манументальныя збудаванні Еўропы. Мегаліты і менгіры. Даместыкацыя, жывёлагадоўля, матычнае земляробства. Ганчарства і ткацтва. Марскі і рачны транспарт. Матрыярхат.

**Тэма 3 Энеаліт і бронзавы век.**
**Пераход ад веку каменя да эпохі металу**

Авалоданне каляровымі металамі. Самародная медзь. Коўка і ліццё. Асноўныя цэнтры каляровай металургіі. З'яўленне бронзы. Новыя віды прылад працы і зброі. Падзел на качэўнікаў і земляробаў. Пераход да патрыярхату. Узнікненне дзяржаў, рабства і войнаў. Ювелірныя вырабы. Гандлёвыя сувязі.

**Тэма 4 Плямёны бронзавага веку.**
**Помнікі матэрыяльнай культуры**

Земляробчыя плямёны Азіі і Еўропы. Трыпольская культура. Індаеўрапейскія плямёны. Археалагічная культура «баявых сякер» і «шнуравай керамікі». Новы пахавальны абрад – спальванне трупаў (крэмацыя). Узнікненне курганных могільнікаў. Кантакты з цывілізацыямі Азіі і Паўночнай Афрыкі. Марскі і сухапутны транспарт.

**Тэма 5 Плямёны жалезнага веку.**
**Помнікі матэрыяльнай культуры**

Матэрыяльная культура кімерыйцаў. Скіфская цывілізацыя і яе дасягненні. Матэрыяльная культура кельтаў, сарматаў, германцаў, балтаў і фіна-уграў. Пахавальны абрад, адзенне, рамёствы, узбраенне, земляробства і жывёлагадоўля. Ювелірнае мастацтва, «звярыны» стыль. Уплывы грэчаскай і рымскай цывілізацый на развіццё матэрыяльнай культуры.

## Раздзел II Старажытныя цывілізацыі Усходу

### Тэма 6 Старажытныя цывілізацыі народаў Месапатаміі. Помнікі матэрыяльнай культуры

Шумерская цывілізацыя. Клінапіс. Шумерскае войска. Змены ў сельскай гаспадарцы. Храмавая і жылыя пабудовы. Зікураты. Вавілонская дзяржава. Дзяржава хетаў. Вынаходства жалеза. Асірыя. Ашурбаніпал і яго бібліятэка. Мідыя. Персідская дзяржава. Паштовая служба персаў.

### Тэма 7 Старажытны Егіпет. Дасягненні ў галіне матэрыяльнай культуры

Прадметны свет у егіпцян. Скульптура і муміі. Культ пахавання. Асаблівасці будаўніцтва. Ужыванне папіруса і егіпецкая пісьменнасць. Егіпецкі каляндар. Абеліскі. Сфінксы. Шкларобства. Фінікійская цывілізацыя. Сувязі з крыта-мікенскай культурай. Матэрыяльная культура Егіпта эпохі Пталемеяў. Расшыфроўка егіпецкіх іерогліфаў.

### Тэма 8 Цывілізацыі Далёкага Усходу. Помнікі матэрыяльнай культуры

Кітай у эпоху бронзы. Кітайская пісьменнасць. Вынаходства шоўку. Вялікі шаўковы шлях. Развядзенне рысу і чайных кустоў. Канфуцыянства і будызм і іх уплыў на матэрыяльную культуру. Архітэктура і скульптура. Уплыў кітайскай культуры на японскую. Кітайская і японская медыцына. Рамёствы і сельская гаспадарка. Японскі тэатр. Культура сялян і самураяў.

## Раздзел III Цывілізацыі антычнасці

### Тэма 9 Элада і элінізм. Дасягненні ў галіне матэрыяльнай культуры

Крыта-мікенская цывілізацыя. Помнікі матэрыяльнай культуры старажытнай Элады. Асаблівасці забудовы антычных гарадоў.

Антрапаморфнасць рамесніцкага мастацтва. Узбраенне. Кераміка. Адзенне і мода. Сельская гаспадарка.

Грэчаскі флот і гарады-калоніі. Кантакты з навакольным варварскім светам.

Культура эпохі элінізму ў Еўропе і Азіі. Вядомыя помнікі архітэктуры. Цуды свету. Александрыйскі маяк, Галікарнаскі маўзалей і статуя бога Геліоса на востраве Радос. Храм Артэміды Эфескай. Статуя Зеўса Алімпійскага.

**Тэма 10 Рымская цывілізацыя.**
**Помнікі матэрыяльнай культуры**

Старажытны Рым эпохі рэспублікі і імперыі.. Новыя будаўнічыя матэрыялы. Узбраенне рымскага войска. Сельская гаспадарка, прылады працы. Рамёствы. Выраб зброі і рэчаў двайнога прызначэння. Асаблівасці гарадскога асяроддзя і побыту. Рымская кераміка і тэракота. Мэбля і кухонны посуд. Адзенне і мода.

## Раздзел IV Эпоха Сярэднявечча (V – XV стст.)

**Тэма 11 Візантыйская цывілізацыя. Дасягненні ў галіне матэрыяльнай культуры**

Стварэнне Візантыйскай дзяржавы. Уплыў на матэрыяльную культуру Італіі. Горад і сельскія паселішчы. Інтэр'ер і мэбля. Візантыйскі ваенны і гандлёвы флот. Уплыў хрысціянства на матэрыяльную культуру. Візантыйская фрэска, мазаіка і абразы. Касцюм візанційцаў. Рэчы свецкага і царкоўнага прызначэння. Паліваная кераміка. Вырабы са шкла.

**Тэма 12 Краіны мусульманскага свету.**
**Помнікі матэрыяльнай культуры**

Арабская цывілізацыя. Уплыў ісламу на матэрыяльную культуру. Культавыя і жылыя будынкі. Вынаходства ў галіне медыцыны (спірт,

акуляры). Апрацоўка металу (срэбра і дамаская сталь) і шкла. Уплыў арабскай цывілізацыі на еўрапейскую культуру.

Асманская імперыя і яе культура. Мусульманская архітэктура. Матэрыяльная культура Ірана ў эпоху сярэднявечча.

## Тэма 13 Матэрыяльная культура заходніх славян. Польша,Чэхія, Славакія.

Заходнія славяне ў VIII – IX стст. Палабскія славяне і іх заваяванне немцамі. Узнікненне Польскай дзяржавы. Уплыў хрысціянства на матэрыяльную культуру.

Узбраенне польскага рыцара. Змаганне з крыжакамі. Архітэктура Польшчы ў XVI – XVIII стст. Варшава – новая сталіца Польшчы. Уплыў каталіцызму і пратэстантызму на матэрыяльную культуру. Адзенне і мода.

Вялікая Маравія ў IX – X стст. Забудова гарадоў. Гусіцкія войны. Узбраенне і ваенная тактыка гусітаў. Шкларобства Багеміі. Матэрыяльная культура Славакіі.

## Тэма 14 Матэрыяльная культура паўднёвых славян і Венгрыі

Развіццё сельскай гаспадаркі і рамёстваў. Уплыў ісламу на матэрыяльную культуру Босніі і Герцагавіны. Харватыя і Славенія. Уплывы Германіі і Аўстрыі.

Стварэнне Венгерскай дзяржавы ў цэнтры Еўропы. Прыняцце каталіцызму. Сельская гаспадарка і рамёствы. Матэрыяльная культура Венгрыі. Забудова гарадоў. Узбраенне і штодзённы побыт.

## Тэма 15 Матэрыяльная культура ўсходніх славян (V – XI стст.).

Рассяленне славян у VII – VIII стст. Матэрыяльная культура ўсходнеславянскіх плямён (крывічы, дрыгавічы, вяцічы, драўляне, радзімічы, паляне). Ганчарства. Кавальства і ювелірная справа. Кантакты з аварамі,

хазарамі і варагамі. Адзенне, пахавальны абрад, асноўныя этнічныя прыкметы. Славянскія капішчы, гарадзішчы і селішчы, водны транспарт.

Помнікі гісторыі і культуры Кіеўскай Русі. Язычніцкія храмы і язычніцкая міфалогія. Уплыў Візантыі ў X – XI стст. Прыняцце хрысціянства і змены ў побыце. Новы пахавальны абрад. Каменнае дойлідства. Ганчарства, кавальства, шкларобства і ювелірная справа. Узнікненне гарадоў. Уплыў варажскай культуры. Развіццё пісьменнасці і адукацыі. Кіеў у X – XII стст. – буйнейшы цэнтр славянскай культуры. Матэрыяльная культура печенегаў і полаўцаў.

**Тэма 16 Матэрыяльная культура старажытнага Ноўгарада. Старажытныя Пскоў і Цвер. Помнікі матэрыяльнай культуры**

Наўгародскія славене і іх кантакты з фіна-угорскімі плямёнамі. Узнікненне самастойнай Наўгародскай дзяржавы ў XII ст. Калоніі Ноўгарада, землі і пяціны. Выхад да Белага мора і заснаванне Салавецкага манастыра. Наўгародскі флот і гандлёвыя сувязі. Наўгародская архітэктурная школа і школа іканапісу.

Ноўгарад – горад-помнік сусветнай спадчыны. Наўгародская Сафія і Наўгародскі крэмль. Археалагічнае вывучэнне Ноўгарада. Берасцяныя граматы.

Пскоўскія крывічы і іх матэрыяльная культура. Пскоў у складзе Наўгародскай дзяржавы. Дзейнасць Даўмонта. Пскоўскі Кром і Даўмонтаў горад. Гарадскія ўмацаванні Пскова. Набыццё незалежнасці ў XIV ст. Пскоўская архітэктурная школа. Пячорскі манастыр і горад-крэпасць Ізборск. Сельская гаспадарка і рамёствы. Волжскія крывічы.

Узнікненне Вялікага княства Цвярскога ў XIII ст. Канкурэнцыя з Вялікім княствам Маскоўскім. Архітэктура і летапісанне. Вандроўка Афанасія Нікіціна ў Індыю. Узбраенне і фінансы. Заваяванне Цверы і Пскова Маскоўскай дзяржавай.

## Раздзел V Новы час

### Тэма 17 Эпоха Адраджэння XV – XVI стст.
### Матэрыяльная культура Італіі, Іспаніі і Нідэрландаў

Перадумовы Рэнесанса ў гарадах-дзяржавах Італіі. Адкрыцці ў галіне архітэктуры і мастацтва. Цікавасць да антычнай культуры. З'яўленне урбаністыкі і садова-паркавай архітэктуры. Перабудова Рыма. З'яўленне бастыённых замкаў і палявой артылерыі. Уплыў гуманізму на матэрыяльную культуру і выяўленчае мастацтва. Гарады-дзяржавы Італіі: Венецыя, Генуя, Мілан, Фларэнцыя, Піза і Рым. Помнікі архітэктуры, скульптура, марскі флот і гандлёвыя сувязі італьянскіх дзяржаў у эпоху Адраджэння.

Іспанская Рэканкіста. Хрысціянскія каралеўствы і мусульманскія дзяржавы на Пірэнейскім паўвостраве. Уплыў ісламу на матэрыяльную культуру Іспаніі. Архітэктура іспанскіх гарадоў.

Вялікія геаграфічныя адкрыцці. Матэрыяльная культура Іспаніі і Партугаліі. Флот, рамёствы і гандаль. З'яўленне ў Еўропе новых сельскагаспадарчых культур (тытунь, маіс, бульба, фасоль і інш.).

Паўстанне ў Нідэрландах супраць іспанскага панавання. Узнікненне незалежнай дзяржавы Галандыі і яе росквіт. Марскі флот, рамёствы, выяўленчае мастацтва і архітэктура.

### Тэма 18 Матэрыяльная культура Украіны

Тэрыторыя Украіны ў XII-XIII стст. Галіцкая архітэктурная школа. Змаганне з полаўцамі. Росквіт Галіцка-Валынскага княства ў XIII ст. Напад мангола-татараў. Украіна пад уладай Залатой Арды. Украіна ў складзе ВКЛ. Архітэктура заходняй Украіны. Помнікі Львова.

Узнікненне ўкраінскіх казакоў. Запарожская Сеч: узбраенне, флот, рамёствы. Рэестравыя казакі. Украіна ў складзе Польшчы і Рэчы Паспалітай. Узнікненне ўніяцкай царквы. Войны з Крымскім ханствам і Турцыяй. Паўстанне пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага і далучэнне да Маскоўскай

дзяржавы. Гетманская і слабадская Украіна. Украінскае барока. Ліквідацыя ўкраінскай аўтаноміі ў XVIII ст. Заходняя Украіна ў складзе Аўстра-Венгрыі.

### Тэма 19 Матэрыяльная культура Маскоўскай дзяржавы

Уладзіміра-Суздальская Русь у XII – XIII стст. Архітэктура і выяўленчае мастацтва. Разанскае княства ў XII-XIII стст. Мангола-татарская навала і яе ўплыў на матэрыяльную культуру. Рускія землі ў складзе Залатой Арды. Узнікненне і ўзвышэнне Масквы. Масква ў XIV-XV стст. Маскоўскі Крэмль – помнік сусветнай архітэктуры. Уплыў італьянскага рэнесансу на будаўнічую тэхніку і архітэктуру Маскоўскай дзяржавы.

Маскоўская дзяржава ў XVI ст. Войны з ВКЛ, Рэччу Паспалітай і Крымскім ханствам. Дваранская конніца і яе ўзбраенне. Рэформы Івана IV. Роля праваслаўнай царквы. Манастыры як асяродкі культуры, мастацтва і ваенныя крэпасці. Руская шатровая архітэктура. Заваяванне Казанскага і Сібірскага ханстваў. Ваенная архітэктура, умацаванні Смаленска, Масквы і іншых гарадоў.

Мяшчанская слабада ў Маскве. Рускае (нарышкінскае) барока канца XVII ст. Асваенне Сібіры і Далёкага Усходу.

### Тэма 20 Матэрыяльная культура Еўропы эпохі барока

Уплыў рэфармацыі і контррэфармацыі на матэрыяльную культуру. З'яўленне урбаністыкі. Развіццё агнястрэльнай зброі. Мода і аддзенне ў XVI – XVIII стст. Архітэктура Італіі, Францыі і Германіі. Садова-паркавая архітэктура. Дзейнасць ордэна іезуітаў. Першыя мануфактуры. Стыль ракако і яго ўплыў на матэрыяльную культуру Заходняй Еўропы. Венецыянскае і багемскае шкло. Саксонскі фарфор ХУІІІ ст. Каланіяльныя тавары. Эпоха Асветніцтва.

### Тэма 21 Ежа і напоі ў эпоху сярэднявечча і Новага часу

Уплыў асноўных рэлігій на ўжыванне ежы і напояў. Спецыфіка хрысціянства, мусульманства, іудаізму і будызму. Асноўныя прадукты харчавання сялян, гараджан, рамеснікаў, шляхты і магнатаў. Сервіроўка стала. З'яўленне сурвэтак, талерак, відэльцаў і сталовага посуду. Ежа маракоў. Роля солі ў харчаванні. Цукар як адзін з прысмакаў і яго вытворчасць. Роля прыпраў і іх экспарт у Еўропу. Розныя віды алею. Кулінарыя і кулінары. Першыя кулінарныя кнігі. З'яўленне кавярняў і рэстаранаў. Сістэма харчавання святароў, манахаў і вайскоўцаў. Нацыянальная кухня.

### Тэма 22 Адзенне ў эпоху сярэднявечча і новага часу. Стыль і мода

Уплыў хрысціянства на адзенне еўрапейцаў. Візантыйскае адзенне. Адзенне арабаў. Вопратка духавенства, магнатаў, сялян і рамеснікаў. Адзенне эпохі Каралінгаў. Гатычная мода (XII – XIV стст.). Нацыянальнае адзенне і мода еўрапейскіх народаў у эпоху Рэнесанса і барока. Іспанская, італьянская, французская, англійская і галандская мода.

Адзенне і вопратка народаў Усходняй Еўропы (Рэч Паспалітая і Маскоўская дзяржава). Ювелірныя вырабы і ўпрыгожванні, звязаныя з адзеннем і модай. Буржуазны стыль XVII – XVIII стст.

## Раздзел VI. Еўропа і ЗША ў канцы XVIII – XX стст.

### Тэма 23 Матэрыяльная культура эпохі класіцызму (канец XVIII – першая палова XIX ст.)

Еўропа ў перыяд класіцызму (канец XVIII – першая палова XIX ст.). Сусветная каланіяльная сістэма. Гандлёвыя сувязі і каланіяльныя тавары. Архітэктура і планіроўка гарадоў. Рускі класіцызм. Санкт-Пецярбург – новая еўрапейская сталіца. Істотныя змены ў матэрыяльнай культуры Расіі ў пачатку XVIII ст. Змены ў адзенні, побыце і узбраенні. Інтэр’ер і мэбля эпохі ампіру.

Знаёмства з егіпецкай цывілізацыяй. Раскопкі Пампеі і Геркуланума. Першая чыгунка ў Англіі.

### Тэма 24 Матэрыяльная культура Еўропы і ЗША ў другой палове XIX ст .– першай палове XX ст.

Матэрыяльная культура ЗША. Вайна за незалежнасць у канцы XVIII ст. Тэхнічная рэвалюцыя ў XIX – пачатку XX ст. Вынаходства тэлеграфа і тэлефона. Амерыканская архітэктура. Ліквідацыя рабства і змены ў сельскай гаспадарцы.

Каланіяльны падзел свету ў пачатку XX ст. Архітэктура мадэрна і канструктывізму. Амерыканскія хмарачосы. Першая сусветная вайна. Новыя віды транспарту і ўзбраенняў. Таталітарныя дзяржавы Еўропы. Іх архітэктура, скульптура ў стылі неакласіцызму. Еўрапейская мода і адзенне. Уплыў амерыканскай культуры.

### Тэма 25 Матэрыяльная культура Еўропы і ЗША ў другой палове XX ст.

Другая сусветная вайна і яе ўплыў на развіццё матэрыяльнай культуры. Савецкая матэрыяльная культура. Палітыка індустрыялізацыі.

Выкарыстанне атамнай энергіі. Новыя віды транспарту. З'яўленне тэлебачання і касмічныя праграмы. Першыя ЭВМ і камп'ютэры. З'яўленне інтэрнета. Хіпі і панкі. Маладзёжная мода і адзенне. З'яўленне грамадства спажывання.

## 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 3.1 Тэматыка семінарскіх і практычных заняткаў

Семінарскія і практычныя заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да стварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме.

#### Семінар 1 Плямёны жалезнага веку. Помнікі матэрыяльная культура

1. Вынаходства жалеза і яго выкарыстанне;
2. Скіфская цывілізацыя;
3. Помнікі матэрыяльнай культуры кельтаў і германцаў;
4. Вялікае перасяленне народаў.

Літаратура:

1. Большая иллюстрированная энциклопедия древностей. – Прага: Артая, 1984. – 496 с.
2. Бутрамееў, У. Вялікія славутыя старажытнага свету / У. Бутрамееў. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1995. – 175 с.
3. Древние цивилизации / С. С. Аверинцев, В.П. Алексеев, В. Г. Ардзинба [и др.]; под общ. ред. Г. М. Бонгард-Левина. – Москва : Мысль, 1989. – 479 с.

#### Семінар 2 Матэрыяльная культура заходніх славян. Польшча, Чэхія і Славакія

1. Помнікі архітэктуры Кракава і Варшавы;
2. “Злата Прага”. Помнікі архітэктуры;
3. Ваенныя дасягненні табарытаў;
4. Архітэктура Брацiславы.

Літаратура:

1. Гимбутас М. Славяне. Сыны Перуна / Пер. С англ. Ф.С. Капицы. – М.: ЗАО Центрполиграф, 2003. – 216 с.

2. История средних веков / под ред. Ф.Н. Колесницкого. – М.: Просвещение, 1986. 575 с.: ил.

3. Семаковіч Мар’ян. Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і народа X – XXI стст. Варшава: Demart, 2005. Demart, 2005. – 321 с.

4. Трусаў, А.А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V-XV стст.) / Алег Анатольевіч Трусаў. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас,2017. – 356 с.

**Семінар 3 Матэрыяльная культура паўднёвых славян і Венгрыі**

1. Помнікі архітэктуры Балгарыі;
2. Уплыў Візантыі на матэрыяльную культуру паўднёвых славян;
3. Помнікі архітэктуры Сербіі;
4. Узнікненне Будапешта. Горад на Дунаі.

Літаратура:

1. Гісторыя сярэдніх вякоў. Заходняя Еўропа і Візантыя (V – XIII ст.). Вучэбны дапаможнік. У дзювух частках. Частка 1. (Пад рэд. В.А. Фядосіка, І.Х. Еўтухова). Мінск. БДУ. 2002. – 353 с.

2. Трусаў, А.А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V-XV стст.) / Алег Анатольевіч Трусаў. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас,2017. – 356 с.

3. Удальцова, З. В. Византийская культура / З.В. Удальцова. – Москва: Наука, 1988. - 288 с.

**Семінар 4 Матэрыяльная культура ўсходніх славян (V-XI стст.)**

1. Пражская археалагічная культура;
2. Доўгія курганы крывічоў;
3. Славянскія капішча;
4. Уплыў хрысціянства на матэрыяльную культуру ўсходніх славян.

Літаратура:

1. Оргиш, В. П. Древняя Русь: Образование Киевского государства и введение христианства / Под ред. Е. М. Бабосова. – Мн.: Наука и техника, 1988. – 150 с.

2.Рыбаков, Б.А. Язычество Древней Руси. Москва, Наука. 1988. – 783 с.

3. Трусаў, А.А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V-XV стст.) / Алег Анатольевіч Трусаў. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2017. – 356 с.

**Семінар 5 Матэрыяльная культура Еўропы эпохі барока**

1. Контррэфармацыя і дзейнасць ордэна іезуітаў. Іезуітскія калегіумы і акадэміі;

2. Гужавы транспарт Еўропы XVI – XVIII стст.;

3. Басціённыя замкі;

4. Кальвінскія зборы і ўніяцкія храмы.

Літаратура:

1. Дубянецкі, Э. Сусветная культура: ад старажытнасці да нашых дзён / Э. Дубянецкі. Мн.: БелЭН, 2001. – 240 с.: іл.

2. Пітэр, Б. Народная культура Еўропы ранняга новага часу / Б. Пітэр. – Мінск: Тэхналогія, 1999. – 380 с.

3. Трусаў, А. Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі / А. Трусаў. – Мінск: Харвест, 2015. – 464 с.

**Семінар 6 Ежа і напоі ў эпоху сярэднявечча і Новага часу**

1. Асноўныя прадукты харчавання ў сярэднявечча;

2. Новыя сельскагаспадарчыя расліны, прывезеныя з Новага света і іх распаўсюджванне;

3. З'яўленне вытворчасці спірту і гарэлкі;

4. З'яўленне кавы, какавы і чаю.

Літаратура:

1. Бродель, Ф. Время мира / Ф. Бродель // Материальная цивилизация. Экономика и катипализм: в 3 т. – Москва: Прогресс, 1992. – Т. 3. – С. 589.

2. Бродель, Ф. Структура повседневности: возможное и невозможное / Ф. Бродель // Материальная цивилизация. Экономика и капитализм: в 3 т. – Москва: Прогресс, 1986. – Т. 1. – 622 с.

3. Молчанова, Л. А. Очерки материальной культуры белорусов XVII-XVIII вв. / Л. А. Молчанова. – Минск: Наука и техника, 1981. – 112 с.

**Семінар 7 Адзенне ў эпоху Сярэднявечча і Новага часу.
Стыль і мода**

1. Уплыў розных рэлігій на адзенне чалавека;

2. Адзенне розных краін сярэднявечнай Еўропы;

3. Сарматскі стыль;

4. Нацыянальная мода XVI-XVIII стст. Іспанія, Венгрыя, Францыя, Галандыя.

Літаратура:

1. Вейс, г. Внешний быт народов с древнейших времён : в 3 т. / Г. Вейс. – Москва, 1873-1879. – Т. 1-3.

2. Дубянецкі, Э. Сусветная культура: ад старажытнасці да нашых дзён / Э. Дубянецкі. Мн.: БелЭН, 2001. – 240 с.: іл.
3. Мальдзіс, А. Як жылі нашы продкі ў XVIII ст.? / А. Мальдзіс. – Мінск: Лімарыус, 2001. – 384 с.

**Семінар 8 Матэрыяльная культура Еўропы і ЗША ў другой палове XX ст.**

1. Уплыў матэрыяльнай культуры ЗША на краіны Еўропы пасля 1945 года;
2. Развіццё новых тэхналогій. Космас. Экалогія, медыцына, транспарт;
3. Новыя віды сувязі;
4. Стыль “хай-тэк” у архітэктуры.

Літаратура:

1. Бернатосян, С.Г. Тысяча и одно чудо света: в 2 ч. / С.Г. Бернатосян // Шедевры инженерной мысли. – Минск: Асар; СПб.: Эрудит, 2001. - Ч. 2. – 304 с.
2. Дубянецкі, Э. Сусветная культура: ад старажытнасці да нашых дзён / Э. Дубянецкі. Мн.: БелЭН, 2001. – 240 с.: іл.
3. Качановский, В. В. История культуры Западной Европы / В. В. Качановский. – Минск: Экоперспектива, 1998.

## 3.2 Тэматыка практычных заняткаў

**Тэма 1 Еўрапейская архітэктура. Гісторыя будаўнічых матэрыялаў. Асноўныя сістэмы каменных муровак.**

Заняткі адбываюцца ў 403 аўдыторыі, дзе ёсць выстава будаўнічых матэрыялаў XI – XX стст.

Заданне:

1. Расказаць пра гісторыю цэглы
2. Расказаць пра гісторыю дахоўкі
3. Расказаць пра гісторыю плітак падлогі
4. Вызначыць асноўныя тыпы каменных муровак.

Літаратура:

1. Трусаў, А. Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі / А. Трусаў. Мінск: Харвест, 2015. – 464 с.
2. Трусаў, А.А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI – XVIII ст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі / А.А. Трусаў. Мінск: Лекцыя 2001. – 204 с.
3. Ястрембицкая, А.Л. Западная Европа XI – XIII веков. Москва: “Искусство”, 1978. – 176 с.

**Тэма 2 Еўрапейская архітэктура. Гісторыя будаўнічых канструкцый**

Заняткі адбываюцца ў 403 аўдыторыі.

Заданне: напісаць рэфераты на наступныя тэмы і агучыць іх на занятках:

1. Гісторыя канструкцый сцен і падмуркаў
2. Гісторыя дзвярэй і вакон
3. Гісторыя балконаў, вітражоў і дымнікаў
4. Асноўныя канструкцыі дахаў

Літаратура:

1. Архітэктура Беларусі: Нарысы эвалюцыі на ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. У 4 т. Т. 1. IX – XIV ст. / А.І. Лакотка [і інш.] – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 394 с.
2. Трусаў, А.А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI – XVIII ст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі / А.А. Трусаў. Мінск: Лекцыя, 2001. – 204 с.
3. Carol Davidson Cragoe. Jak czytać architekturę. Najważniejsze informacje o stylach i detalach. Warszawa: Wydawnictwo Arkady,2015. – 256 с.

**Тэма 3 Шэдэўры еўрапейскай готыкі**

Адбываецца прагляд слайдаў з выявамі помнікаў архітэктуры XIV – XVI стст.

Заданне: Напісаць і агучыць рэфераты з іх электроннай прэзентацыяй на тэмы:

1. Сабор Парыжскай Божай Маці
2. Домскі сабор у Рызе
3. Кёльнскі сабор
4. Касцёл св. Ганны ў Вільне
5. Мірскі замак
6. Абарончыя беларускія храмы

Літаратура:


1. Трусаў, А.А. Старонкі мураванай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму / А.А. Трусаў. – Мінск: “Навука і тэхніка”, 1990. – 191 с.
2. Трусаў, А.А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V – XV стагоддзі) / Алег Анатольевіч Трусаў. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2017. – 356 с.

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі матэрыяльнай культуры.

Форма выканання работы – напісанне рэфератаў, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме (па выбару).

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай.

## 4.2 Пытанні да самаправеркі

1. Тры этапы (перыяды) каменнага веку.
2. Неалітычная рэвалюцыя
3. Пераход ад веку камня да эпохі метала
4. Скіфская цывілізацыя
5. Помнікі матэрыяльнай культуры народаў Месапатаміі
6. Сем цудаў свету
7. Антычная архітэктура
8. Візантыйская цывілізацыя
9. Арабская цывілізацыя
10. Матэрыяльная культура Кіеўскай Русі
11. Вялікія геаграфічныя адкрыцці
12. Дакалумбавая цывілізацыя Амерыкі
13. Эпоха Адраджэння. Помнікі матэрыяльнай культуры
14. Раманская архітэктура
15. Гатычная архітэктура
16. Матэрыяльная культура ВКЛ
17. Матэрыяльная культура Рэчы Паспалітай
18. Архітэктура барока і ракако
19. Тэхнічная рэвалюцыя XVIII-XIX ст.

20. Архітэктура класіцызма
21. Матэрыяльная культура ЗША
22. Архітэктура мадэрна і канструктывізма
23. Тэхнічная рэвалюцыя XX ст.

## 4.3 Пытанні да экзамена

1. Адзенне ў X-XYIII стст. Стыль і мода.
2. Асноўныя прадукты харчавання. Гісторыя ежы.
3. Асноўныя прадукты харчавання. Напоі.
4. Гарады як феномены цывілізацыі. Будаўніцтсва і жыллё ў Еўропе ў IX-XVIII стст.
5. Гарады-дзяржавы Італіі. Помнікі матэрыяльнай культуры Венецыі.
6. Гарады-дзяржавы Італіі. Помнікі матэрыяльнай культуры Генуі і Мілана.
7. Гарады-дзяржавы Італіі. Помнікі матэрыяльнай культуры Фларэнцыі і Рыма.
8. Еўрапейская готыка. Архітэктура Германіі.
9. Еўрапейская готыка. Архітэктура Францыі.
10. ЗША. Помнікі матэрыяльнай культуры (XVIII-XIX стст.).
11. Кіеўская Русь. Помнікі матэрыяльнай культуры (X-XII стст.).
12. Маскоўская дзяржава. Помнікі матэрыяльнай культуры (XIII-XVII стст.).
13. Матэрыяльная культура Англіі эпохі Сярэднявечча і Новага часу.
14. Матэрыяльная культура беларускага горада (X-XYIII стст.).
15. Матэрыяльная культура Венгрыі (X-XIX стст.).
16. Матэрыяльная культура Германіі эпохі Сярэднявечча і Новага часу.
17. Матэрыяльная культура Еўропы у першай палове XX ст.
18. Матэрыяльная культура Еўропы ў XIX ст.
19. Матэрыяльная культура заходніх славян. Маравія, Чэхія і Славакія.
20. Матэрыяльная культура заходніх славян. Польшча.
21. Матэрыяльная культура Іспаніі эпохі Сярэднявечча і Новага часу.
22. Матэрыяльная культура Візантыі.

23. Матэрыяльная культура Літвы. Помнікі архітэктуры старажытнай Вільні.
24. Матэрыяльная культура народаў Скандынавіі.
25. Матэрыяльная культура паўднёвых славян. Балгарыя.
26. Матэрыяльная культура паўднёвых славян. Сербія, Харватыя, Боснія і Герцэгавіна.
27. Матэрыяльная культура Расійскай імперыі (XVIII-пачатак XX стст.).
28. Матэрыяльная культура Украіны (XII-XVIII стст.).
29. Матэрыяльная культура ўсходніх славян (УІ-IX стст.).
30. Матэрыяльная культура Францыі эпохі Сярэднявечча і Новага часу.
31. Матэрыяльная культура Арабскага халіфата.
32. Медыцына і ахова здароўя ў XV-ХУІІІ стст.
33. Помнікі матэрыяльнай культуры ЗША ў XX ст.
34. Помнікі матэрыяльнай культуры СССР.
35. Старажытны Ноўгарад. Помнікі матэрыяльнай культуры.
36. Старажытны Пскоў. Помнікі матэрыяльнай культуры. Матэрыяльная культура Цвяры.
37. Сучасная Еўрапеская цывілізацыя. Асноўныя дасягненні ў сферы матэрыяльнай культуры.
38. Тэхнічная рэвалюцыя і транспарт.
39. Эпоха барока. Помнікі архітэктуры Еўропы.
40. Эпоха класіцызма. Помнікі архітэктуры Еўропы.

## 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

### 5.1 Тэматычны план

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ занят. |
| Уводзіны | 2 | 2 | |
| ***Раздзел I. Першабытнае грамадства*** | 12 | 10 | 2 |
| Тэма 1. Станаўленне матэрыяльнай культуры чалавецтва ў перыяд каменнага веку | 2 | 2 | |
| Тэма 2. Каменны век Еўропы | 2 | 2 | |
| Тэма 3. Энеаліт і бронзавы век. Пераход ад веку каменя да эпохі металу | 2 | 2 | |
| Тэма 4. Плямёны бронзавага веку. Помнікі матэрыяльнай культуры | 2 | 2 | |
| Тэма 5. Плямёны жалезнага веку. Помнікі матэрыяльнай культуры | 4 | 2 | 2 |
| ***Раздзел II. Старажытныя цывілізацыі Усходу.*** | 6 | 6 | |
| Тэма 6. Старажытныя цывілізацыі народаў Месапатаміі. Помнікі матэрыяльнай культуры | 2 | 2 | |
| Тэма 7. Старажытны Егіпет. Дасягненні ў галіне матэрыяльнай культуры | 2 | 2 | |
| Тэма 8. Цывілізацыі Далёкага Усходу. Помнікі матэрыяльнай культуры | 2 | 2 | |
| ***Раздзел III. Цывілізацыі антычнасці*** | 4 | 4 | |
| Тэма 9. Элада і элінізм. Дасягненні ў галіне матэрыяльнай культуры | 2 | 2 | |
| Тэма 10. Рымская цывілізацыя. Помнікі матэрыяльнай культуры. | 2 | 2 | |
| ***Раздзел IV. Эпоха Сярэднявечча (V-XV стст.)*** | 12 | 6 | 6 |
| Тэма 11. Візантыйская цывілізацыя. Дасягненні ў галіне матэрыяльнай культуры | 2 | 2 | |
| Тэма 12. Краіны мусульманскага свету. Помнікі матэрыяльнай культуры | 2 | 2 | |
| Тэма 13. Матэрыяльная культура заходніх славян. Польшча, Чэхія і Славакія. | 2 | | 2 |
| Тэма 14. Матэрыяльная культура паўднёвых славян і Венгрыі. | 2 | | 2 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тэма 15. Матэрыяльная культура ўсходніх славян (V – XI стст.). | 2 | | 2 |
| Тэма 16. Матэрыяльная культура старажытнага Ноўгарада. Старажытныя Пскоў і Цвер. Помнікі матэрыяльнай культуры | 2 | 2 | |
| ***Раздзел V. Новы час*** | 12 | 6 | 6 |
| Тэма 17. Эпоха Адраджэння XV – XVI стст. Матэрыяльная культура Італіі, Іспаніі і Нідэрландаў | 2 | 2 | |
| Тэма 18. Матэрыяльная культура Украіны | 2 | 2 | |
| Тэма 19. Матэрыяльная культура Маскоўскай дзяржавы | 2 | 2 | |
| Тэма 20. Матэрыяльная культура Еўропы эпохі барока | 2 | | 2 |
| Тэма 21. Ежа і напоі ў эпоху сярэднявечча і новага часу | 2 | | 2 |
| Тэма 22. Адзенне ў эпоху сярэднявечча і новага часу. Стыль і мода | 2 | | 2 |
| ***Раздзел VI. Еўропа і ЗША ў канцы XVIII - XX стст.*** | 6 | 4 | 2 |
| Тэма 23. Матэрыяльная культура эпохі класіцызму (канец XVIII - першая палова XIX ст.) | 2 | 2 | |
| Тэма 24. Матэрыяльная культура Еўропы і ЗША ў другой палове XIX ст .– першай палове XX ст. | 2 | 2 | |
| Тэма 25. Матэрыяльная культура Еўропы і ЗША ў другой палове XX ст. | 2 | | 2 |
| **Разам ...** | **54** | **38** | **16** |

## 5.2 Асноўная літаратура


1. Архітэктура Беларусі: Нарысы эвалюцыі на ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. У 4 т. Т. 1. IX – XIV ст. / А.І. Лакотка [і інш.] – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 394 с.
2. Бартенев, А. Очерки истории архитектурных стилей / Н.А. Бартенев, В. Н. Батажкова. – Москва : Изобразительное искусство, 1983. – 384 с.
3. Большая иллюстрированная энциклопедия древностей. – Прага: Артая, 1984. – 496 с.

4. Бродель, Ф. Время мира / Ф. Бродель // Материальная цивилизация. Экономика и капитализм: в 3 т. – Москва : Прогресс, 1992. – Т. 3. – С. 598.
5. Бродель, Ф. Структура повседневности: возможное и невозможное / Ф. Бродель // Материальная цивилизация. Экономика и капитализм: в 3 т. – Москва : Прогресс, 1986. – Т. 1. – 622 с.
6. Бутрамееў, У. Вялікія славутыя старажытнага свету / У. Бутрамееў. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995. – 175 с.
7. Гимбутас М. Славяне. Сыны Перуна / Пер. С англ. Ф.С. Капицы. – М.: ЗАО Центрполиграф, 2003. – 216 с.
8. Гісторыя сярэдніх вякоў. Заходняя Еўропа і Візантыя (V – XIII ст.). Вучэбны дапаможнік. У дзювух частках. Частка 1. (Пад рэд. В.А. Фядосіка, І.Х. Еўтухова). Мінск. БДУ. 2002. – 353 с.
9. Древние цивилизации / С. С. Аверинцев, В. П. Алексеев, В.Г. Ардзинба [и др.]; под обш. ред. Г. М. Бонгард-Левина. – Москва : Мысль, 1989. – 479с.
10. История средних веков / под ред. Ф.Н. Колесницкого. – М.: Просвещение, 1986. – 575 с.: ил.
11. Качановский, В. В. История культуры Западной Европы / В.В. Качановский. – Минск : Экоперспектива, 1998.
12. Кес, Д. Стили мебели / Д. Кес. – Будапешт, 1981. – 269 с.
13. Кушнярэвіч, А.М. Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага / А.М. Кушнярэвіч. – Мінск : Беларуская навука. – 2011. – 234 с.
14. Молчанова, Л. А. Очерки материальной культуры белорусов ХУII – ХУIII вв. / Л. А. Молчанова. – Мінск : Наука и техника, 1981. – 112 с.
15. Народная культура Беларусі: энцыклапедычны даведнік / пад рэд. В. С. Цітова. – Минск : БелЭн, 2002. – 432 с.

16. Оргиш, В. П. Древняя Русь: Образование Киевского государства и введение христианства / Под ред. Е. М. Бабосова. – Мн.: Наука и техника, 1988. – 150 с.
17. Пітэр, Б. Народная культура Еўропы ранняга новага часу / Б. Пітэр. – Мінск: Тэхналогія, 1999. – 380 с.
18. Рыбаков, Б.А. Язычество Древней Руси. Москва, Наука. 1988. – 783 с.
19. Семаковіч Мар'ян. Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і народа X – XXI стст. Варшава: Demart, 2005. Demart, 2005. – 321 с.
20. Трусаў, А.А. Старонкі мураванай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму. / А.А.Трусаў // – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 191 с.
21. Трусаў, А.А. Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах. / А.Трусаў. – Мінск: Кнігазбор, 2009. – 152 с.
22. Трусаў, А.А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V-XV стст.) / Алег Анатольевіч Трусаў. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2017. – 356 с.
23. Удальцова, З. В. Византийская культура / З. В. Удальцова. – Москва: Наука, 1988. – 288 с.
24. Чикалов, Р. А. Западная Европа и Соединённые Штаты Америки (1815-1918 годы) / Р. А. Чикалов, Н. Р. Чжалова. – Минск : Тесей, 2000. – 504 с.

**5.3 Дадатковая літаратура**

1. Бернатосян, С.Г. Тысяча и одно чудо света: в 2 ч. / С.Г. Бернатосян // Шедевры ннженерной мысли. – Минск : Асар; СПб.: Эрудит, 2001. – Ч. 2. – 304 с.
2. Вейс, Г. Внешний быт народов с древнейших до наших времён: в 3 т. / Г. Вейс. – Москва, 1873-1879. – Т. 1-3.
3. Дубянецкі, Э. Сусветная культура: ад старажытнасці да нашых дзён / Э. Дубянецкі. – Мінск : БелЭн, 2001. – 240 с.: іл.

4. Жизнь и нравы старого Китая // Д. Макгован. Китайцы у себя дома; Н. Коростовец. Китайцы и их цивилизация. – Смоленск : Русич, 2003. – 457 с.
5. Лазука, Б. А. Слоўнік тэрмінаў: архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / Б. А. Лазука. – Мінск.: Беларусь, 2001. – 158 с.
6. Мальдзіс, А. Як жылі нашы продкі ў XVIII ст.? / А. Мальдзіс. – Мінск : Лімарыус, 2001. – 384 с.
7. Порьяз, А. Мировая культура: Возрожденне. Эпоха великих географических открытий / А. Порьяз. – Москва : Олма-Пресс, 2001. – 529 с.: іл.
8. Пронников, В.А. Японцы (этнопсихологический очерк) / В.А. Пронников, Н. Д. Ладанов. – М. : ВлМ, 1996. – 400 с.
9. Рамбо, А. Исторня древней и новой России / А. Рамбо.– Смоленск: Руснч, 2001. – 637 с.: іл.
10. Сидихменов, В. Я. Китай: страницы прошлого / В.Я. Сидихменов. – Москва: Наука, 1987. – 446 с.
11. Смирнова, Е. Д. Средневековый мир в терминах, именах и названиях: словарь-справочик / Е. Д. Смирнова, Л. П. Сушкевич, В.А. Федосик. – Минск : Беларусь, 1999. – 383 с.
12. Трусаў, А.А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI – XVIII ст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі / А.А. Трусаў. Мінск: Лекцыя, 2001. – 204 с.
13. Трусаў, А. Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі / А. Трусаў. – Мінск: Харвест, 2015. – 464 с.
14. Carol Davidson Cragoe. Jak czytać architekturę. Najważniejsze informacje o stylach i detalach. Warszawa: Wydawnictwo Arkady,2015. – 256 с.